■ Нам пішуць

# Бібліятэка – кладзезь ведаў

**Ганаруся, што ўмею сябраваць з кнігай!**

Кожны год амаль на ўсе летнія канікулы прыязджаю да бабулі ў Мазыр. Дзякуючы таму, што ў яе раёне існуе бібліятэка № 4, моцна пасябравала з кнігай. Дарэчы, нашы сяброўскія стасункі пачаліся дзесьці з пяці гадоў, калі яшчэ нават чытаць не ўмела. Тады мяне цікавілі кнігі-альбомы з рознакаляровымі малюнкамі, а потым, згодна свайго ўзросту, стала адкрываць для сябе цікавыя кнігі. Хачу адзначыць, што рабіць гэта мне заўсёды дапамагалі бібліятэкары. Відавочна, што тут працуюць людзі, якія любяць сваю справу, таму кожны наведвальнік адчувае сябе жаданым. Мне нават пашчасціла ўдзельнічаць у мерапрыемствах. Вельмі цікавымі сталі захапляльны літаратурны часопіс «Героі кніг завуць да экрана», а таксама гульня «Уперад з капітанам Врунгелем», якія надоўга застануцца ў памяці. Жадаю супрацоўнікам бібліятэкі моцнага здароўя, душэўнай гармоніі і творчых поспехаў у працы. Дзякуючы ім я прачытала ўвесь спіс літаратуры, дадзены на лета.

**Надзея ВАЛЯЛКІНА,**
**г. Мінск, СШ № 136**
**(13 гадоў).**